ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта
П.Я. Красько

# Планы правядзення пасяджэнняў вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў пачатковых класаў (гасцявы абмен) на 2023/2024 навучальны год

УЗГОДНЕНЫ
Пратакол пасяджэння метадычнага савета
19.09.2023 № 1

# Адзіная метадычная тэма

## *«Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў па пытаннях выхавання і развіцця асобы вучня сродкамі вучэбных прадметаў»*

**МЭТА:** удасканаленне тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі педагогаў, засваенне сучасных адукацыйных тэхналогій для павышэння якасці адукацыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**ЗАДАЧЫ:**

актуалізаваць і паглыбіць веды педагогаў па пытаннях выхавання і развіцця асобы вучня, удасканальваць методыку выкладання вучэбных прадметаў;

уключыць педагогаў у дзейнасць па засваенню спосабаў рэалізацыі выхаваўчага і развіваючага патэнцыяла вучэбных і факультатыўных заняткаў, выхаваўчых мерапрыемстваў;

забяспечыць умовы для ўзаеманавучання педагогаў у рамках гасцявога абмену, засваення і ўкаранення ў адукацыйны працэс эфектыўнага педагагічнага вопыту.

**ПАСЯДЖЭННЕ 2**

**ТЭМА:** Фарміраванне асобасных якасцей вучняў пачатковых класаў сродкамі вучэбнага прадмета “Беларуская мова” на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**МЭТА:** удасканаленне прафесійнага майстэрства настаўнікаў пачатковых класаў па пытаннях рэалізацыі задач фарміравання асобасных якасцей вучняў пачатковых класаў сродкамі вучэбнага прадмета “Беларуская мова”.

**ЗАДАЧЫ:** актуалізаваць веды педагогаў аб сучасных педагагічных тэхналогіях, формах і метадах навучання на ўроках беларускай мовы ў пачатковай школе;

пазнаёміць з эфектыўным педагагічным вопытам па актывізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пачатковых класаў на вучэбных занятках па беларускай мове;

на практычным узроўні забяспечыць засваенне педагогамі прыёмаў работы з вучэбнымі тэкстамі, якія маюць каштоўнасна-сэнсавую накіраванасць і садзейнічаюць выхаванню і развіццю асобы вучняў.

**ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ:** гасцявы абмен.

**ДАТА ПРАВЯДЗЕННЯ:** снежань 2023 года.

**МЕСЦА ПРАВЯДЗЕННЯ:** дзяржаўная ўстанова адукацыі “Матвееўская сярэдняя школа”.

**СКЛАД УДЗЕЛЬНІКАЎ:** члены вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў пачатковых класаў.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ БЛОК:**

1. Вучэбная дзейнасць на ўроках беларускай мовы як фактар развіцця асобы малодшага школьніка.

   *настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа в.Ізабелін”*

2. Шляхі і сродкі актывізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пачатковых класаў на вучэбных занятках па беларускай мове ў аспекце асобаснага росту вучня.

   *настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа аг. Юбілейны”*

3. Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыяла вучэбнага прадмета “Беларуская мова” на вучэбных занятках у пачатковых класах (праз змест, формы арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроку).

   *настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Падароская сярэдняя школа”*

4. Выбары сакратара вучэбна-метадычнага аб’яднання на 2023/2024 навучальны год.

**ПРАКТЫЧНЫ БЛОК:**

1. Наведванне, самааналіз і аналіз урока беларускай мовы ў 4 класе.

2. Распрацоўка фрагментаў урокаў з выкарыстаннем вучэбных тэкстаў, якія маюць каштоўнасна-сэнсавую накіраванасць, абазначэннем форм арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

**МЕТАДЫЧНЫ ПРАДУКТ:** метадычны зборнік “Эфектыўныя формы і сродкі арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроку беларускай мовы”.

**ЛІТАРАТУРА:**

1. Бялова, Ю. В. Кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні па беларускай мове. 2 клас / Ю. В. Бялова // Пачатковае навучанне :сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2017. – № 2. – С. 7–14.

2. Гулецкая, Е. А. Лінгвістычныя асновы навучання арфаграфіі ў пачатковых класах / Е. А. Гулецкая / / Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 1999. – № 8. – С. 4-5.

3. Свірыдзенка, В. І. Выкарыстанне кампетэнтнасна арыентаваных заданняў па беларускай мове для ацэнкі эфектыўнасці фарміравання маўленчай культуры вучняў IV класа / В. І. Свірыдзенка // Пачатковая школа. –2017. –№ 11.— С. 7 – 10.

4. Свірыдзенка, В. І. Дыягнастычныя матэрыялы па вучэбным прадмеце “Беларуская мова”. 3 клас / Ю. В. Бялова // Пачатковае навучанне :сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2017. – № 2. – С. 14–20.

5. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры вучняў III класа ў працэсе асваення метапрадметных уменняў / В. І. Свірыдзенка // Пачатковая школа. –2017. –№4.— С. 5 – 10

**ПАСЯДЖЭННЕ 3**

**ТЭМА**: Фарміраванне матэматычных кампетэнцый вучняў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі пры рашэнні тэкставых задач.

**МЭТА:** павышэнне тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў па пытаннях фарміравання матэматычных кампетэнцый вучняў пачатковых класаў пры рашэнні тэксавых задач.

**ЗАДАЧЫ:** раскрыць сутнасць паняцця “математычныя кампетенцыі”;

актуалізаваць веды педагогаў па методыцы рашэння тэкставых задач з выкарыстаннем метада мадэліравання;

вызначыць эфектыўныя прыёмы работы, накіраваныя на фарміраванне матэматычных кампетэнцый вучняў пачатковых класаў;

на практычным узроўні забяспечыць засваенне педагогамі пастраення розных відаў вучэбных мадэляў пры рашэнні тэкставых задач.

**ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ:** гасцявы абмен.

**ДАТА ПРАВЯДЗЕННЯ:** люты 2024 года.

**МЕСЦА ПРАВЯДЗЕННЯ:** дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа в.Ізабелін”

**СКЛАД УДЗЕЛЬНІКАЎ:** члены вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў пачатковых класаў.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ БЛОК:**

1. Навучанне рашэнню тэкставых задач як фактар фарміравання матэматычных кампетэнцый малодшых школьнікаў.

*настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа аг. Юбілейны”*

2. Метадычныя асаблівасці выкарыстання метада мадэліравання пры фарміраванні ўмення рашаць тэкставыя задачы.

*настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Падароская сярэдняя школа”*

3. Прыёмы фарміравання матэматычных кампетэнцый вучняў пачатковых класаў у працэсе навучання рашэнню тэкставых задач.

*настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Матвееўская сярэдняя школа”*

**ПРАКТЫЧНЫ БЛОК:**

1. Наведванне, самааналіз і аналіз урока матэматыкі ў 3 класе.
2. Практычны занятак па пастраенню розных відаў вучэбных мадэляў пры рашэнні тэкставых задач.

**МЕТАДЫЧНЫ ПРАДУКТ:** метадычны веснік “Класіфікацыя вучэбных мадэляў. Прыклады іх выкарыстання пры рашэнні тэкставых задач”.

**ЛІТАРАТУРА:**


1. Бабанский, Ю.К. Методы обучения в современной общеобразовательной школе / Ю.К.Бабанский. — М.: Просвещение, 1985. — 208 с.
2. Белошистая, А.В. Методика обучения математике в начальной школе: курс лекций: учеб.пособие для студентов вузов / А.В.Белошистая. – М.: ВЛАДОС, 2007. – 455 с.
3. Бородулько, М.А. Обучение решению задач и моделирование / М.А.Бородулько, Л.Г.Стойлова // Начальная школа. — 1996. — №8. — С. 26-32.
4. Демидова, Т. Е. Алгебраический метод решения текстовых задач для нахождения арифметического способа их решения / Т. Е. Демидов, А. П. Тонких // Начальная школа. – 2001. – № 3.
5. Істоміна Н. Б. Праца над састаўной задачай / / Пачатковая школа, 2008, №2.
6. Мядзведская, В. М. Тэхналогія фарміравання ў малодшых школьнікаў агульных уменняў работы над задачай / В. М. Мядзведская // Пачатковая школа. – 2002. – № 4.


Старшыня А.В. Амброжка